УДК 745.542(476)"20"

# ПАПЯРОВЫЯ ВЫЦІНАНКІ Ў ІНТЭР’ЕРЫ СЯЛЯНСКАГА ЖЫЛЛЯ Ў БССР

***В. А. Лабачэўская,*** *доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле абагульнены матэрыялы з архіваў, музеяў, публікацый і экспедыцый аб папяровых выразках – выцінанках, якія ўжываліся для аздаблення вясковых хат у БССР, і даецца апісанне артэфактаў са збора аўтара. У 1920–80-я гг. ажурныя выразкі з таннай паперы і газет – сурвэткі, ручнікі на абразы, фіранкі – былі распаўсюджаным відам аздобы сялянскага інтэр’еру. У сваёй сацыяльна-культурнай функцыі яны могуць быць ахарактарызаваныя як сімулякры – замяшчальнікі маладаступных калгаснікам фабрычных тэкстыльных вырабаў. Разам з тым у мастацкім плане выцінанка ў гэты перыяд развіваецца як від народнага дэкаратыўнага мастацтва, што стварыла падставы для ўздыму сучаснага мастацтва выразання ў Беларусі.

**Ключавыя словы:** выразка з паперы, выцінанка, інтэр’ер, народнае мастацтва.

# PAPER CUTTINGS IN THE INTERIOR PEASANT HOUSING IN THE BSSR

***O. Lobachevskaya,*** *Doctor of Art History, Associate Professor, Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article summarizes materials from archives, museums, publications, and expeditions about paper cut-outs that were used to decorate village houses in the BSSR, and provides a description of the artifacts in the author's collection. In the 1920–80s, openwork cut-outs made of cheap paper and newspapers – napkins, towels for insults, curtains – were a common type of decoration of the peasant interior. In their socio-cultural function, they can be described as simulacra – substitutes for factory textile products that are not readily available to collective farmers. At the same time, artistically, paper cuttings develops as a type of folk decorative art in this period, which created the basis for the rise of the modern art of carving in Belarus.

**Keywords:** paper cut-out, interior, folk art.

У апошні час мастацтва выцінанкі атрымала значнае развіццё ў Беларусі. Шукаючы карані гэтага віду мастацтва ў беларускай культуры, даследчыкі разглядаюць традыцыі папяровых кустодыяў – выразак, якія захоўвалі сургучныя пячаткі на дакументах, а таксама фіранкі і сурвэткі, якімі вясковыя жанчыны аздаблялі свае сціплыя інтэр’еры, і пры гэтым адзначаюць адсутнасць музейных збораў такіх артэфактаў [2, с. 5].

Для стварэння больш дасканалай і аб’ектыўнай базы вывучэння гісторыі беларускай выцінанкі варта абагульніць матэрыялы з архіваў, музеяў, публікацый, экспедыцый, якія былі назапашаны аўтарам артыкула.

Першым, хто звярнуў увагу на простыя аздабленні беларускай сялянскай хаты, быў А. К. Сержпутоўскі. Збіраючы калекцыі для Расійскага музея этнаграфіі ў Санкт-Пецярбурзе, ён у 1924 г. прывёз з вёскі Суш Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні тры выцінанкі (РЭМ, кал. 4166 – 81–83). Яны маюць форму круглай разеткі дыяметрам 33 см і выкананы з жоўтай паперы. Гэтыя творы можна лічыць найбольш раннімі ўзорамі беларускай выцінанкі ў музейных зборах. Зафіксавана ўжыванне выразак з паперы ў матэрыялах экспедыцыі 1927 г. у Бабруйскую акругу БССР А. Я. Дуйсбург – супрацоўніцы Расійскага этнаграфічнага музея. На адным з фотаздымкаў бачым аздабленне пярэдняга кута – «покуці» – у хаце Вольгі Вернік з вёскі Убібацькі Любанскага раёна (РЭМ, кал. 4679 – 9). Выразкі з паперы ўпрыгожвалі вокны, у якасці фіранак змяшчаліся ў куце і добра спалучаліся з папяровымі шпалерамі на сценах хаты, што сведчыць пра тое, што ў 1920-я гг. папяровыя аздобы з’яўляюцца ў інтэр’еры сялянскага жылля БССР.

У архіве Расійскага этнаграфічнага музея захоўваецца яшчэ адно дакументальнае сведчанне распаўсюджвання папяровых выразак у беларускай вёсцы ў гэты час. На адным з фотаздымкаў (РЭМ, кал. 4595) можна ўбачыць чырвоны кут у хаце Лысенкава і яго сям’ю, якая ў поўным зборы сядзіць на лаўках каля стала з самаварам у чаканні госця. Бажніца ў куце прыаздоблена белымі папяровымі фіранкамі. Выразкі з зубчыкамі і дзірачкамі змешчаны на сценах абапал іконы. Над акном таксама вісіць фіранка з паперы, а над імі – ікона з вышываным ручніком. Можна казаць, што выцінанкі ўтвараюць агульны дэкаратыўны комплекс аздобы інтэр’ера. Фотаздымак магчыма датаваць 1920-мі гг., г. зн. да пачатку антырэлігійнай барацьбы ў БССР, аб чым сведчыць наяўнасць у хаце абразоў. На фотаздымках экспедыцыі А. Я. Дуйсбург ва Усходняе Палессе 1932 г. былі зафіксаваны хаты калгаснікаў у вёсцы Заполле Петрыкаўскага раёна, дзе ўжо замест ікон вісяць партрэты Леніна, Сталіна і членаў палітбюро, а на вокнах у якасці аздобы – папяровыя выразкі і кветкі (РЭМ, кал. 5787 – 60–61).

Актыўна змяняўся калгасны побыт і жыллё ў БССР у пасляваенны час, што знайшло адлюстраванне ў працы этнографаў М. А. Грынблата і Л. А. Малчанавай «Новыя з’явы ў быце калгаснай вёскі (Спроба этнаграфічнага вывучэння калгаса “Бальшавік” Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці)» 1958 г., якая была падрыхтавана па выніках экспедыцыі сектара этнаграфіі і народнай творчасці Інстытута гісторыі АН БССР [1]. Даследчыкі адзначылі, што ў вёсках у выніку паляпшэння дабрабыту і роста культурных запатрабаванняў сялян тканне палатна для

бялізны амаль прыпынілася, пры тым пашырыўся выраб дэкаратыўных посцілак, у т. л. з ужываннем фабрычных рознакаляровых нітак; вялікім попытам карысталіся маляваныя на палатне дываны, якія набываліся на рынках; набіўка на тканіне, роспіс куфараў, інкрустацыя саломкай рамак для фотаздымкаў. Пры гэтым было заўважана, што цюлевыя і гардзінныя фіранкі і заслоны выціскаюць з калгаснага быту такі від народнага мастацтва, як аздобы з паперы: «Да знікаючых з калгаснага быту відаў народнага мастацтва трэба аднесці аздобы з паперы. Яшчэ нядаўна вельмі пашыраная ажурная проразь паперы, якая скарыстоўвалася ў якасці фіранак на верхнія часткі акон, з ростам культурных запатрабаванняў і дабрабыту калгаснікаў стала выцясняцца цюлевымі і гардзіннымі фіранкамі. Але яшчэ і зараз можна бачыць папяровыя фіранкі з ажурнапраразным узорам, часта дапоўненым роспісам. З каляровай паперы захаваліся яшчэ такія насценныя аздобы, як пярэстыя веера – "матылі" і кветкі, што размяшчаюцца на раме люстр, на рамках для фота ці проста на сцяне» [1, с. 114–115]. Таксама было адзначана, што ў некаторых хатах сцены ў месцах, якія прылягаюць да кута, аздабляюцца самаробнымі шпалерамі – невялікімі лістамі белай паперы з намаляванымі рознакаляровымі кветкамі; і толькі зрэдку сцены аклейваюцца пакупнымі шпалерамі [1, с. 112].

З экспедыцыі 1945 г. па тагачаснай Маладзечанскай вобласці М. Грынблат прывёз некалькі ўзораў размаляваных папяровых фіранак на вокны, а таксама самаробных газетных шпалер, на якіх намаляваны кветкі [3] [1]. Ажурная «афіранка» з ружамі выразана нажніцамі з упаковачнай паперы памерам 96×42 см Нінай Мадзілка (1922 г. нар.) з вёскі Восава былога Крывічскага раёна. Стан выразкі сведчыць аб тым, што яна была ва ўжытку (мал. 1).

Каштоўным іканаграфічным дакументам, які сведчыць аб форме і арнаменце тагачасных выцінанак, служыць фотаздымак 1946 г. са збору Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў (БДАКФФД, нег. 12458). На пастановачным фота паказаны гурток, якія складаецца пераважна з жанчын ў вышываных строях, у цэнтры якога малады музыка грае на скрыпцы (мал. 2). Падзея адбываецца ў клубным ці выставачным памяшканні, святочна прыбраным. Адна сцяна пакоя аздоблена тканым дываном, на другой бачны 9 круглых папяровых разетак. Выцінанкі досыць адмысловыя і разнастайныя па арнаменце і, напэўна, каляровыя. Акно завешана вышыванымі ручнікамі, з-пад якіх праглядае ажурная папяровая фіранка, выразаная вуглом. Анатацыя ўтрымлівае інфармацыю, што гэта моладзевая вечарына ў калгасе «Савецкая Беларусь», аднак не пазначана дакладнае месца яго знаходжання. Калгасаў з такой назвай у БССР было шмат, нават у адным раёне. Па строях дзяўчат, апранутых у вышываныя адвольнай гладдзю

[1] Аўтар выказвае ўдзячнасць І. Ю. Смірновай за інфармацыю аб гэтай крыніцы.

сарочкі на гэстках, і па манеры завязвання хустак можна з пэўнасцю вызначыць, што фота зроблена ў Жыткавіцкім ці Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці. Пацвярджае такую лакалізацыю здымка з прыгожымі выцінанкамі ўзор амаль ідэнтычнай ім разеткі, якая знаходзіцца ў зборы аўтара (мал. 3). Выцінанка мае дыяметр 21 см, выразана з газеты, датаванай 1980 г., і расфарбавана каляровай тушшу ў тры колеры: ліловы, чырвоны і зялёны. Выразка мае назву «кружок» і была набыта ў 1984 г. у вёсцы Мілашэвічы Лельчыцкага раёна. Яна вісела сярод іншых падобных, але адрозных па арнаменце «кружкоў», якія размяшчаліся паміж вышыванымі ручнікамі, развешанымі на сценах пакоя.



*Мал. 1. Афіранка, 1944 г., вёска Восава Мядзельскака раёна Мінскай вобласці (Аддзел рукапісаў і рэдкіх кніг Навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. Фонд 42. Воп. 1. Адз. зах. 137. Ар. 35)*



*Мал. 2. Моладзевая вечарына ў калгасе «Савецкая Беларусь», 1946 г. (БДАКФФД, нег. 12458)*



*Мал. 3. Выцінанка-разетка, 1980 г., вёска Мілашэвічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці (са збору аўтара)*

Падчас экспедыцый па даследаванні народнага мастацтва ў 1980-я гг. яшчэ можна было назіраць прысутнасць папяровых выразак ў вясковых інтэр'ерах. З таго часу ў зборы аўтара дадзенага артыкула ёсць дзве прыгожыя фіранкі з вёскі Дайнова Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці, зробленыя ў 1987 г. Марыяй Нос (1914 г. нар.). Фіранкі памерам 54×88 см выразаны з аркушаў, складзеных 8 разоў. Іх праразны арнамент утвараецца з 5- і 4-ярусных геаметрычных элементаў: разнастайных крыжападобных фігур, разетак і квадратных адтулін, якія пры развароце фіранкі ўтвараюць бардзюрныя шэрагі. Выразкі маюць назву «фартушок». Адна з іх, са звычайнай тонкай паперы, вісела пад абразамі. Другая, з пергаментнай паперы, была выканана па замове ў прысутнасці аўтара.

У 1981 г. у вёсцы Ліпкі Лепельскага раёна запісаны звесткі, што выцінанкі рабілі на свята каб аздобіць абразы. Для ўзнаўлення выгляду фіранак быў выкарыстаны метад даследчай рэканструкцыі. У прысутнасці аўтара майстрыха выразала два ўзоры фіранак з геаметрычным разеткавым арнаментам памерам 25×38 см.

Найбольш таленавітыя вяскоўцы рабілі выразкі па замове сваіх аднасяльчан. Так, у вёсцы Барадзянічы Браслаўскага раёна мясцовы мастак-аматар, сталяр і здатны на іншыя рамёствы майстар Антоній Рэдзіка (1899–1980) па мянушцы «Святы Антоній» выразаў папяровыя фіранкі на вокны па замове сваіх аднавяскоўцаў. У вёсцы Тракелі Воранаўскага раёна Рэгіна Бурач (1937 г. нар.) выразала выцінанкі па замове і карысталася досыць адмысловай тэхнікай, якая не сустракалася ў іншых мясцовасцях. У зборы аўтара артыкула ёсць тры яе фіранкі памерам 17×50 см, выкананыя з калькі (паўпразрыстай паперы) у прысутнасці аўтара. Калька складзена 6 разоў, на адным са складаў спачатку алоўкам былі пазначаны вялікія і малыя кветкі. Затым манікюрнымі нажніцамі майстрыха, пракалваючы паперу па абрысу кветак, адвольна выцінала фон. У выніку невялікія дзірачкі разам стварылі ажур. У некаторай ступені гэта тэхніка нагадвае вышыўку «рышэлье», пры якой спачатку ствараецца раслінны малюнак, а потым выразаецца фон тканіны паміж яго часткамі.

Архіўныя звесткі, іканаграфічныя дакументы, аўтэнтычныя ўзоры выцінанак, звесткі аб іх ўжыванні, вырабе і саміх стваральніках, атрыманыя даследчыкамі ў 1940–80-я гг. у экспедыцыях, каштоўныя тым, што яны адлюстроўваюць апошні перыяд існавання гэтага віду народнага мастацтва ў беларускай вёсцы, калі ім займаліся здольныя да мастацкай творчасці жанчыны і існавалі майстры, якія рабілі выцінанкі па замове. Павелічэнне дабрабыту сялян і распаўсюджанне прамысловага тэкстылю для аздаблення інтэр'еру ў пачатку 1990-х гг. фактычна прыпынілі далейшае развіццё выцінанкі як вясковага мастацтва.

1. *Грынблат, М. Я.* Новыя з'явы ў быце калгаснай вёскі (спроба этнаграфічнага вывучэння калгаса «Бальшавік» Хойніцкага раёна Гомельскай воб-

ласці) / М. Я. Грынблат, Л. А. Малчанава // Беларус. этнагр. зб. / Акад. навук БССР ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: І. С. Краўчанка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1958. – С. 107–121.

2. *Сахута, Я. М.* Беларуская выцінанка / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2008. – 227 с.

3. Фонд М. Я. Грынблата. Аддзел рукапісаў і рэдкіх кніг Навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Фонд 42. Воп. 1. Адз. зах. 1370.

УДК [78.089.81:780.616.432](476)

## ТЕМА ИСТОРИЧЕСКОГО ПРОШЛОГО В СБОРНИКЕ ЕЛЕНЫ АТРАШКЕВИЧ «КОНЦЕРТНЫЕ ПЬЕСЫ ДЛЯ ДВУХ РОЯЛЕЙ»

***И. В. Лазаретова,*** *старший преподаватель кафедры духовой музыки учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** Статья посвящена недавно вышедшему сборнику «Концертные пьесы для двух роялей» известного белорусского композитора, председателя Белорусского союза композиторов Елены Атрашкевич. Пьесы имеют средний уровень сложности, не превышающий возможности учащихся старших классов музыкальных школ и младших курсов музыкальных колледжей по классу фортепиано. Также сборник может быть использован для выработки навыков ансамблевой фортепианной игры студентов музыкальных УВО, обучающихся игре на духовых и ударных инструментах. Рассмотрена семантика пьес, воплощение в них темы исторического прошлого не посредством программных названий, а через обращение к музыкальным формам и жанрам, репрезентирующим разные эпохи.

**Ключевые слова:** фортепиано, пьесы, историческое прошлое, жанр, музыкальная форма.

## THE THEME OF THE HISTORICAL PAST IN THE COLLECTION OF ELENA ATRASHKEVICH «CONCERT PIECES FOR TWO PIANOS»

***I. Lazaretova,*** *Senior Lecturer of the Brass Music Department of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article is devoted to the recently published collection «Concert Pieces for Two Pianos» by the famous Belarusian composer, chairman of the Belarusian Union of Composers Elena Atrashkevich. These pieces have an average level of complexity, not exceeding the ability of senior students of music schools and